пасля таго, як «праганяць» зіму са словамі: «Ідзі, зыма, до Кракова, зноў ты прыйдыш однакова» (гэта ў «Явара» альбо ў "Ворана»). Веснавыя песні пльгагонаў, як «Ой, ужэ ж высна, дай ужэ ж красна», -- цудоўны узор высокамастацкага ўвасаблення таленавітасці палешукоў.

Магічным сэнсам пранізаны творы, што тычацца жніўнага абраду. Жніўныя палескія песні -- гэта высокамастацкія творы, якія знаходзяць новае жыццё ў творчых калектывах і пры навучанні студэнтаў спевам.

Унікальнай з'явай у жыцці палешукоў з вёскі Тышкавічы з'яўляецца абрад вяселля. Мара кожнай дзяўчыны ўладкаваць сваё жыццё, аб пічаслівым шлюбе, прага маладых да працягу пакаленняў нарадзілі вытанчаны , удала размеркаваны на «дзеі» гэты цудоўны абрад. Каб пералічыць колькасць песень, што гучаць на вяселлі, трэба прыкласці вялікія намаганні, бо вяселле доўжыцца тыдзень і болей. Мноства жартаў, прымавак, розных здарэнняў адбываецца ў гэты момант, а самае галоўнае -- адбываецца еднасць моладзі са старэйшымі, з роднымі і блізкімі.

Вяселле ў Тышкавічах можна лічыць унікальным, бо захаваўся абрад у тым выглядзе, як быў стагоддзі таму назад.

Вялікую мастацкую каштоўнасць маюць так званыя палескія «вычоркы». Яны бываюць узімку, калі прадуць кужаль для ручнікоў, абрусаў ці тонкага палатна. Каб ахвотней было прасці, збіраюцца маладзіцы і дзяўчаты асобна па чарзе штодня ў якойнебудзь гаспадыні, увішна прадуць, расказваюць розныя здарэнні, казкі, быліны, а потым з надыходам прыцемак разыходзяцца па сваіх хатах.

Увечары маладыя дзяўчаты збіраюцца ў адной з сябровак, старанна прадуць кудзелю і шмат спяваюць розных песень, акрамя песень пра жніво, вяселле ці вясну, таму што іх яшчэ рана спяваць. Потым прыходзяць хлопцы, наладжваюцца гульні.

Мы ўпэўнены ў тым, што ёсць сэнс і патрэба старанна і мэтанакіравана вывучаць народную песенную творчасць. Трэба прыкласці ўсе намаганні, каб здабыткі нашых продкаў мелі працяг.

Жылінская Н.П.,
выкладчык

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЖАНРУ БАЛАДЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

У беларускай вусна-паэтычнай спадчыне значную групу складаюць ліра-эпічныя песні, за якімі замацавалася назва «балады». Гэтыя творы напоўнены яркімі малюнкамі жыцця нашых продкаў, шчырым пачуццём і роздумам пра лёс чалавека. Яны даюць багаты матэрыял для вывучэння мінулага нашага народа, яго быту, псіхалогіі, уяўленняў пра справядлівасць і прыгажосць.

Тэрмін «балада» канчаткова замацаваўся ў нашай фалькларыстыцы зусім нядаўна, хоць быў вядомы яшчэ ў пачатку XIX ст.

Беларускія народныя балады да апошняга часу не былі прадметам грунтоўнага даследавання. Нявывучанымі заставаліся тэарэтычныя пытанні гэтага жанру, не было дастаткова поўных збораў тэкстаў. Адной з прычын гэтага з'явілася, відаць, тое, што балады не мелі сталага месца ў пазаабрадавым і абрадавым народным рэпертуары. Каб вылучыць баладу як жанр, неабходны перш за ўсё эстэтычныя крытэрыі, комплекс тэматычных, функцыянальных і формаўтваральных прыкмет. У шматлікіх агульных фальклорных публікацыях у адпаведнасці з мясцовай народнай класіфікацыяй ці поглядамі складальнікаў балады траплялі ў «розныя», «сямейна-бытавыя», «бяседныя», «піліпаўскія» і іншыя раздзелы. Цікава, што варыянты аднаго і таго сюжэта часам маюць ледзь не па дваццаць розных прымеркаванняў. Сувязь балады з песнямі і абрадавасцю каляндарных цыклаў абумоўлена праяўленнем агульнасці вытокаў, а таксама дзеяннем моцнай фальклорнай традыцыі, якая так парадкавала песенны рэпертуар, каб кожнаму твору было сваё месца, свой час выканання.

Такім чынам, сцвярджаючы, што наогул балады выконваліся ў любы час, мы павінны мець на ўвазе, што «любы час» тут азначае толькі час, найбольш адпаведны для выканання гэтых доўгіх ліра-эпічных песень, і часта народныя спевакі мелі для іх пэўную пару, неаднолькавую ў розных мясцовасцях.

Што сабою ўяўляе балада ў сюжэтным плане? Балада -- гэта ліра-эпічная песня з напружаным драматычным сюжэтам, якая апавядае пра незвычайныя, часта трагічныя падзеі ў асабістым, сямейным жыцці чалавека. Пераважная большасць балад уздымае маральна-этычныя праблемы: каханне і нянавісць, вернасць, здраду, злачынства і кару. Іх стваральнікаў хвалюе нядоля чалавека, нядобры лёс. Баладзе ўласцівы метад тыпізацыі жыццёвых з'яў. Лічаць, што беларуская балада зарадзілася ў нетрах абрадавай паэзіі ў вельмі старажытныя часы, верагодна, у пераходны перыяд ад першабытнаабшчыннага да феадальнага ладу. Пра гэта можна меркаваць па захаваўшыхся у нас узорах старажытных балад. Многія з іх заснаваны на матывах метамарфозы. У беларускіх баладах метамарфоза адбываецца часцей за ўсё як вынік уздзеяння знешніх сіл, чужой волі (найчасцей праклёнаў маці, свекрыві, радзей бацькі) або па сваёй волі.

Значная колькасць балад змяшчае тыповыя купальскія рэфрэны-заклікі, рэфрэны-абрамленні, што спяваюцца ў пачатку і ў канцы кожнага радка. Зрэдку трапляюцца рэфрэны валачобных песень. Аналіз гэтых балад выяўляе не толькі знешнюю, але і больш глыбокую сувязь іх з абрадавай паэзіяй. Беларускія балады захавалі адносна невялікую колькасць выпадкаў сувязі з карагодамі (у выглядзе непасрэднай прымеркаванасці) у сучасным жывым выкананні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нягледзячы на значную колькасць грунтоўных прац, у якіх выяўляюцца вытокі і мастацкая прырода балады як жанру вусна-паэтычнай народнай творчасці, балада ўсё ж застаецца адным з найменш даследаваных жанраў у беларускай і ўсходнеславянскай музычнай фалькларыстыцы. Гістарычныя і сацыяльныя ўмовы адбіваліся на самім жанры і формах яго бытавання. Разнастайнасць відаў балад, іх неаднароднасць, функцыянальная разнастайнасць спрыялі захаванню стылістычных з'яў, уласцівых розным этапам развіцця музычнага мастацтва.

Яканюк Н.П.,
канд. мастацтвазнаўства,
дацэнт

## БЕЛАРУСКАЯ НАРО́ДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА ПІСЬМОВАЙ ТРАДЫЦЫІ ЯК АБ'ЕКТ ДАСЛЕДАВАННЯ

Народна-інструментальная музычная культура рэспублікі з'яўляецца важнай часткай духоўнага жыцця беларусаў. Багацце і разнастайнасць формаў і жанраў, у якіх выступае гэтая культура, яе шматвяковая гісторыя сведчаць аб той значнай ролі, якую яна адыгрывае ў беларускім музычным мастацтве.

Сучасная беларуская народна-інструментальная культура -- з'ява далёка не аднародная. Яе ўмоўна можна падзяліць на два адносна самастойныя пласты -- культуру вуснай традыцыі, ці так званы інструментальны музычны фальклор, карані якога цягнуцца з глыбіні стагоддзяў, і культуру пісьмовай традыцыі. Апошняя, нягледзячы на даволі кароткую, не больш за сто год, гісторыю, тым не менш займае ў наш час значнае месца ў мастацкім жыцці рэспублікі. Гэта яркая з'ява нацыянальнай музычнай культуры ўжо даўно патрабуе навуковага аналізу і асэнсавання. Але ж у беларускім музыказнаўстве народна-інструментальная культура пісьмовай традыцыі дагэтуль яшчэ не стала прадметам спецыяльнага вывучэння. Яўна адчуваюцца супярэчнасці паміж узроўнем развіцця гэтай культуры і ступенню яе даследавання, чым і абумоўліваецца цікавасць да гэтай праблемы. Да таго ж патрабуюць хутчэйшага вырашэння надзённыя праблемы сучаснай мастацкай практыкі ў разглядаемай галіне, якія абвастраюцца ва ўмовах новых сацыяльна-палітычных адносін.

Беларуская народна-інструментальная музычная культура пісьмовай традыцыі -- з'ява надзвычай складаная. Даследаванне яе патрабуе не толькі гістарычнага, але і сістэмнага комплекснага падыходу. Патрэбна ўлічваць, што гэтая культура ўяўляе шматузроўневую своеасаблівую сістэму, якая складаецца з многіх узаемазалежных і ўзаемаабумоўленых элементаў як духоўнага, так і матэрыяльнага парадку. Сярод іх музычны інструментарый, традыцыі вырабу музычных інструментаў, сістэма адукацыі і нацыянальна-выканальніцкая школа ігры на гэтых інструментах, арыгінальная музыка, створаная для ігры на іх, і г.д. Кожны з названых элементаў павінен разглядацца асобна як самастойны прадмет даследавання і адначасова ў сукупнасці элементаў, якія складаюць сістэму. Пры гэтым неабходна сумяшчаць адначасова некалькі аспектаў даследавання -- эстэтыка-музыказнаўчы, гістарычны і культуралагічны, бо толькі такі ўсебаковы погляд дазваляе разгледзець гэты складаны аб'ект ва ўсёй яго разнастайнасці.

Разглядаючы народна-інструментальную музычную культуру пісьмовай традыцыі як асобны пласт музычнай прафесійнай культуры, неабходна ўлічваць яе спецыфічныя сутнасныя рысы. Па-першае, нельга забывацца, што гэта з'ява мае штучнае паходжанне. Яна была створана ў асаблівых гістарычных і мастацкіх умовах, дзякуючы дзейнасці энтузіястаў, аматараў музычнага мастацтва, такіх як В.Андрэеў і М.Белабародава ў Расіі, Дз.Захар і І.Жыновіч ў Беларусі. Хаця творцы яе і абапіраліся на аб'ектыўныя агульныя законы, якія вызначалі станаўленне еўрапейскай музычнай цывілізацыі (удасканаленне музычных інструментаў, прынцыпы стварэння аркестра і яго рэпертуару, фарміраванне выканальніцкай народна-інструментальнай школы і г.д.), але дзеля фарміравання народна-інструментальнай музычнай культуры пісьмовай традыцыі асабліва важную ролю адыгрываў суб'ектыўны фактар. Шляхі і асаблівасці развіцця гэтай культуры вызначаліся наяўнасцю той ці іншай яркай асобы (выканаўцы, кампазітара ці грамадскага дзеяча), якая ў спрыяльных умовах рэалізоўвала ўласны творчы патэнцыял.

Па-другое, трэба памятаць, што народна-інструментальная культура пісьмовай традыцыі ўяўляе своеасаблівае спалучэнне традыцый нацыянальнага інструментальнага музычнага фальклору і агульнаеўрапейскай музычнай культуры. Такая двайстая прырода абумоўлівае адну з найважнейшых праблем гэтай культуры -- праблему суадносін паміж традыцыямі нацыянальнай народна-інструментальнай музычнай спадчыны і акадэмічнай прафесійнай музыкі. Скрозь прызму гэтай праблемы патрэбна разглядаць усе іншыя праблемы народна-інструментальнай культуры.

Не менш важна ўлічваць пры даследаванні і іншыя асаблівасці. Так, калі інструментальны музычны фальклор звязаны ў асноўным з жыццём беларускай вёскі, то культура пісьмовай традыцыі характэрна пераважна для гарадскога побыту. Яшчэ адна адметная рыса -- асаблівая падтрымка народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі з боку дзяржаўных устаноў. Такая ўвага абумоўлена тым, што з першых крокаў свайго існавання гэтая культура разглядалася з боку дзяржаўнай палітыкі як найважнейшы сродак арганізацыі вольнага часу, рэалізацыі творчай актыўнасці шырокіх мас працоўных (перш за ўсё пралетарыята), як сродак далучэння гэтых мас да «сур'ёзнай» класічнай музыкі.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ